Дзяржаўная  ўстанова адукацыі
“Чарацянскі дзіцячы сад-базавая школа”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

# “ТЭКСТАЦЭНТРЫЧНЫ ПАДЫХОД НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ  МОВЫ ЯК УМОВА ФАРМІРАВАННЯ МОЎНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ ВУЧНЯЎ”

Лабанок Наталля Пятроўна,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры
8 (029) 369 - 67 - 33
e-mail: linata26@tut.by

## 1. Інфармацыйны блок

### 1.1. Назва тэмы вопыта

Тэкстацэнтрычны падыход на ўроках беларускай мовы як умова фарміравання моўных кампетэнцый вучняў

### 1.2. Актуальнасць вопыту

Паступальнае развіццё грамадства, узрастанне інфармацыйнай складанасці соцыуму, інтэнсіўнасць развіцця зносін людзей у розных напрамках і на розных узроўнях вымагае новых падыходаў да навучання мове. Грамадства не можа задаволіцца той моўнай падрыхтоўкай новага пакалення, якое вывучае мову дзеля вывучэння, дзеля ведаў аб мове, але не можа карыстацца ёю [3, с.147]. Адзін з асноўных прынцыпаў адбору зместу навучання беларускай мове – прынцып тэкстацэнтрызму. Гэты прынцып мае на ўвазе адбор зместу навучання, які павінен забяспечыць арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту. Тэкст разглядаецца ў якасці мэты, зместу і выніку навучання. Пры такой арганізацыі навучання галоўным дыдактычным матэрыялам з’яўляюцца тэксты, на аснове якіх вырашаюцца задачы, накіраваныя на засваенне норм літаратурнага вымаўлення, граматыкі, правапісу, узбагачаецца слоўнік вучняў, забяспечваецца іх выхаванне і развіццё [1, с.7–8]. У працэсе работы над тэкстам рэалізуюцца як унутрыпрадметныя, так і міжпрадметныя сувязі беларускай мовы і літаратуры, гісторыі, мастацтва. Сучасныя вучні маюць абмежаваны лексічны запас, з цяжкасцямі ўспрымаюць прачытаную інфармацыю, для іх праблематычна дакладна выказаць сваё меркаванне па тым ці іншым пытанні, тым больш скласці ўласныя тэксты ў адпаведнасці з маўленчай сітуацыяй. Правільна падабраны тэкст да вывучэння пэўнай тэмы – гэта і дыдактычны матэрыял для выпрацоўкі практычных маўленчых уменняў і навыкаў, і ўзор для стварэння ўласных тэкстаў. Важны крытэрый выбару тэксту – яго лінгвакультуралагічная адпаведнасць і скіраванасць. Для настаўніка пажадана выкарыстоўваць тэксты, якія здольныя абудзіць у вучняў цікавасць да роднай мовы, народнай творчасці, нацыянальнай культуры  [3, с.150]. Таму лічу, што правільны адбор тэкстаў у

якасці сродку і аб’екту назірання за выкарыстаннем моўных адзінак і узору для стварэння ўласных выказванняў дапамагае настаўніку не толькі аптымізаваць адукацыйны працэс, але і фарміраваць нацыянальную свядомасць асобы вучня.

**1.3. Мэта вопыта**

Фарміраванне моўных кампетэнцый вучняў праз выкарыстанне тэкстацэнтычнага падыходу да выкладання беларускай мовы

**1.4. Задачы вопыта**

- ✓ Развіваць у вучняў навыкі ўсвядомленага чытання, вызначэння тэмы і галоўнай думкі, семантычнай і сінтаксічнай структуры тэксту;
- ✓ Выпрацоўваць навык разумення і адрознення тыпаў і стыляў тэкстаў;
- ✓ Фарміраваць уменні аналізаваць моўныя адзінкі, выкарыстаныя ў тэксце, з пункту гледжання фанетычных, лексічных, арфаэпічных, марфалагічных, сінтаксічных і пунктуацыйных норм;
- ✓ Развіваць уменні і навыкі будаваць уласныя тэксты

**1.5. Працягласць работы над вопытам**

1 этап – прааналізаваны змест метадычнай літаратуры, эфектыўны педагагічны вопыт па тэме, вывучаны рэкамендацыі;

2 этап – зроблены адбор эфектыўных прыёмаў, відаў работы з тэкстам, якія спрыяюць фарміраванню моўных кампетэнцый, распрацаваны адпаведны дыдактычны матэрыял;

3 этап – праведзены параўнальны аналіз узроўню сфарміраванасці ў вучняў уменняў і навыкаў работы з гатовымі тэкстамі і стварэння ўласных тэкстаў. Зроблены вывады, улічаны недахопы, выпрацаваны рэкамендацыі.

## 2. Апісанне тэхналогіі вопыту

**2.1. Вядучая ідэя вопыту**

Вывучэнне мовы на аснове тэксту як спосабу навучання і як прадукту камунікатыўнай дзейнасці дапамагае вучням усвядоміць сістэмны характар мовы, удасканальвае моўныя і маўленчыя ўменні і навыкі, развівае творчы патэнцыял, стымулюе пошук уласных моўных форм.

## 2.2. Апісанне сутнасці вопыту

**2.2.1.** Задача школьнага курса беларускай мовы – навучыць свабодна карыстацца мовай. Ажыццяўленне гэтага магчымае ў сумяшчэнні вывучэння будовы мовы, яе сістэмы з дыферэнцыяльным са стылістычнага пункту гледжання выкарыстаннем лексікі, фразеалогіі, граматычных сродкаў, якія рэалізуюцца ў маўленні, а дакладней, у тэксце. Асноўным аб'ектам і сродкам навучання выступае тэкст, у якім рэалізуюцца ўсе моўныя адзінкі [3, с.147].

Сучасная методыка выкладання прадмета прадугледжвае выкарыстанне тэксту на ўроку як зыходнага матэрыялу (сродку і аб'екту назірання вучняў за выкарыстаннем пэўнай моўнай адзінкі, моўнага факта ў тэксце, праверкі дамашняга задання, тлумачэння новага матэрыялу, актуалізацыі ведаў па пэўнай тэме) і як заключнага (стварэнне вучнямі новых тэкстаў паводле ўзору, тэмы і інш.) [3, с.149].

**2.2.2.** Дадзены вопыт педагагічнай дзейнасці з'яўляецца дэманстрацыяй практычнага выкарыстання тэкстацэнтрычнага падыходу ў пабудове, адборы, структуяванні зместу навучання і арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку беларускай мовы.

**2.2.3.** Асноўныя кампаненты вопыту – прынцыпы адбору дыдактычнага матэрыялу, прыёмы і віды работы вучняў з тэкстам, педагагічныя назіранні за працэсам навучання.

**2.2.4.** Падрыхтоўка ўрока мовы на аснове тэкстацэнтычнага падыходу да арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў пачынаецца з адбору дыдактычнага матэрыялу. Пры гэтым трэба ўлічваць такія крытэрыі да адбору тэкстаў, як інфарматыўнасць, актуальнасць, змястоўнасць, адпаведнасць узросту вучняў, выхаваўчы аспект. Тэксты культуразнаўчай тэматыкі, якія даюць магчымасць вучням паглыбляць веды па гісторыі і геаграфіі Беларусі, знаёміцца з духоўнай культурай і нацыянальнымі традыцыямі беларусаў, тапанімічнымі звесткамі, дзейнасцю славутых землякоў, мінулым і сучасным краіны,спрыяюць не толькі засваенню моўнага матэрыялу, але і фарміраванню нацыянальнай свядомасці асобы вучня.

Другім этапам з’яўляецца вызначэнне відаў работы з тэкстам, распрацоўка заданняў да тэксту. Заданні павінны адпавядаць зместу навучання, мэце і задачам урока, узроставым асаблівасцям вучняў. Абавязковае патрабаванне да заданняў – аднасэнсоўнасць, дакладная фармулёўка. Правільны падбор заданняў да тэксту прадугледжвае комплексны аналіз моўнага матэрыялу, развіццё ўменняў супастаўляць і класіфікаваць моўныя адзінкі, уменняў выкарыстоўваць узорныя моўныя адзінкі пры стварэнні ўласных тэкстаў. Заданняў можа быць больш ці менш у залежнасці ад узроўню навучанасці класа [2, с.54]. Таксама заданні павінны быць цікавымі і разнастайнымі.

Выкарыстоўваю розныя віды заданняў да тэксту: вызначыць тэму і галоўную думку, прааналізаваць або падабраць загаловак, падзяліць тэкст на абзацы, вызначыць межы сказаў, аднавіць дэфармаваны тэкст, скласці план, вусна або пісьмова пераказаць тэкст або яго частку, правесці параўнальны аналіз двух і больш тэкстаў, напісаць працяг тэксту, стварыць паўнавартасны ўласны тэкст на аснове прачытанага, выявіць ў тэксце і прааналізаваць канкрэтныя моўныя з’явы, спісаць тэкст або яго частку з рашэннем арфаграфічных і пунктуацыйных задач, перакласці на рускую мову, правесці карэкцыю дапушчаных памылак, зрабіць схемы сказаў, і іншыя.

У аснове тэкстацэнтычнага падыходу павінны быць сістэмнасць і пераемнасць. У 5-м класе, дзе фарміруецца ўяўленне пра мову як важнейшы сродак зносін, асноўная работа з тэкстам грунтуецца на засваенні арфаграфічных, арфаэпічных, лексічных норм беларускай мовы. У 6 – 7 класах, дзе вывучаецца раздзел “Марфалогія і арфаграфія”, асаблівая ўвага надаецца выяўленню розных часцін мовы ў тэксце, характарыстыцы іх марфалагічных прымет, вызначэнню стылістычнай ролі, ролі ў перадачы ідэйна-тэматычнага зместу. У 8 – 9 класах скіроўваю ўвагу вучняў на выкарыстанне моўных сродкаў у тэкстах розных стыляў, засваенне сінтаксічных і пунктуацыйных норм. Што датычыцца стварэння ўласных тэкстаў, то гэтую работу трэба пачынаць з пятага класа і паступова ўскладняць.

**2.2.5.** Праца з тэкстам у 5-м класе носіць у большай ступені навучальны характар. Вучні на практыцы знаёмяцца з рознымі відамі маўленчай дзейнасці, вучацца выконваць розныя па характары і ступені складанасці заданні, працуюць калектыўна, у парах, індывідуальна. На дадзеным этапе важна развіваць уменне вучняў працаваць з тэкстам як асноўнай моўнай адзінкай. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Прамое і пераноснае значэнне слова” на этапе замацавання вывучанага прапаную тэкст і заданні да яго (дадатак 2.1.), паступовае выкананне якіх дазваляе актуалізаваць веды вучняў па раней вывучаным матэрыяле (раздзелы “Маўленне”, “Сінтаксіс і пунктуацыя”, “Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”), фарміраваць уменне адрозніваць прамое і пераноснае значэнне слова, вызначаць стылістычную ролю слоў, ужытых у пераносным значэнні, развіваць звязнае маўленне, уменне ствараць уласныя тэксты ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай і стылем для будучага выказвання. Тэкст знаёміць вучняў з каляндарна-абрадавым святам Саракі, а значыць, выступае як сродак фарміравання этнакультурнай кампетэнцыі, дае магчымасць успомніць жанры вуснай народнай творчасці, у прыватнасці, прыкметы, вывучаныя раней у курсе беларускай літаратуры, што спрыяе фарміраванню міжпрадметных кампетэнцый.

Дыяпазон відаў заданняў да тэкстаў дастаткова вялікі. Для пяцікласнікаў, якія адаптуюцца да навучання на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі, лічу неабходным захоўваць пераемнасць з пачатковай школай, таму часта прапаную заданні на пільнасць, пошук, гульнёвыя заданні, заданні з элементам спаборніцтва.Уменне ўважліва чытаць тэкст і ўсведамляць прачытанае дазваляюць развіваць наступныя заданні: знайсці словы, якія ўказваюць на час ці месца дзеяння, сфармуляваць пытанні да тэксту, размясціць сказы (часткі сказаў) у тым парадку, у якім яны сустракаюцца ў тэксце, гульнёвае заданне “Так ці не?”, дзе трэба адзначыць верныя сцверджанні ў дачыненні да зместу тэксту, тлумачэнне незразумелых слоў, падбор да іх сінонімаў або рускамоўных адпаведнікаў, работа з тлумачальным, фразеалагічным і іншымі слоўнікамі. Пазнавальную актыўнасць вучняў стымулююць прыёмы “Зоркае вока”, калі

трэба выпісаць або падкрэсліць словы з пэўнай арфаграмай, "Працуем рэдактарамі", калі трэба знайсці і выправіць дапушчаныя ў тэксце памылкі, "Дэфармаваны тэкст", які прадугледжвае ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці сказаў, "Хвілінка кемлівасці", калі трэба аднавіць разбураны верш або сказ, запоўніць пропускі. Пяцікласнікам, як і вучням 6-9 класаў, цікава паспрабаваць разгадаць крыжаванку, якая складаецца са слоў, ужытых у тэксце. Адзін з эфектыўных прыёмаў работы з тэкстам, якая дазваляе вучням назапашваць калектыўны вопыт дзейнасці, – квэст. Для правядзення квэста клас дзеліцца на 2-3 невялікія групы, кожная група атрымлівае маршрутны ліст з заданнем, настаўнік агучвае, колькі часу даецца на выкананне. У квесце прадугледжваю заданні для ўсёй групы і заданні для індывідуальнага выканання, якія вучні самастойна размяркоўваюць паміж сабой [4, с.3].

Напрыклад, квэст на аснове тэксту, які я прапаную вучням на ўроку падагульнення і сістэматызацыі вывучанага па раздзеле "Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія" (дадатак 2.2.).

Такая форма работы спрыяе актыўнаму папаўненню слоўнікавага запасу вучняў, развіццю ўмення выказваць і аргументаваць свае меркаванне, садзейнічае сацыяльнай адаптацыі [4, с.3].

У 6 – 7 класах праца з тэкстам набывае больш складаны характар. Абавязкова прадугледжваю заданні на ўпрыманне, разуменне, трансфармацыю, стварэнне тэкстаў, пашыраецца работа са слоўнікамі. Змест сучасных вучэбных дапаможнікаў адпавядае тэкстацэнтрычнаму падыходу да навучання мове: тэкст выступае сродкам адзінай тэматычнай прасторы. Таму работа з тэкстам праводзіцца на розных этапах урока: матывацыйна-арганізацыйным этапе, пазнавальна-аперацыйным, дыягнастычна-карэкцыйным, у якасці дамашняга задання. З улікам абмежаванасці часу выконваем ад двух да пяці заданняў, пры гэтым аддаецца перавага заданням па новым матэрыяле. Што датычыцца комплекснай работы з тэкстам, якая прадугледжвае вялікую колькасць розназмястоўных заданняў, то аптымальным для сябе лічу арганізоўваць такую работу на ўроках падагульнення і сістэматызацыі вывучанага.

Напрыклад, у 6-м класе на ўроку падагульнення і сістэматызацыі вывучанага па раздзеле “Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія” арганізую работу з тэкстам, абапіраючыся на наступныя задачы: удасканальваць уменні вызначаць склад слова і рабіць словаўтваральны разбор, садзейнічаць асэнсаванню вучнямі ўзаемасувязі, якая існуе паміж адзінкамі розных узроўняў мовы (словаўтваральнымі і фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі), развіваць лексіка-граматычны лад маўлення. Лічу важным для сябе, каб тэкст быў цікавым для вучняў, далучаў іх да нацыянальнай культуры, сямейных традыцый, ствараў умовы для развіцця творчых здольнасцей.

Прапаную вучням тэкст, у якім падаецца цікавая інфармацыя пра паходжанне некаторых фразеалагізмаў са словам “заяц” (дадатак 2.3.).

Дадзены тэкст і заданні да яго дазваляюць не толькі праверыць узровень засваення вучнямі спосабаў словаўтварэння, але і актуалізаваць веды па тэме “Фразеалагізмы”, пашырыць кругагляд школьнікаў з прыцягненнем уласнага жыццёвага вопыту, развіваць уменне згодна з граматычнымі і сінтаксічнымі нормамі дапаўняць сказы, ствараць уласнае выказванне на аснове прачытанага.

Сямікласнікам пры вывучэнні раздзелаў “Дзеепрыметнік”, “Дзеепрыслоўе” падчас работы з тэкстамі абавязкова прапаную заданні на перабудову сказаў. Гэта спрыяе развіццю звязнага маўлення, пашырае слоўнікавы запас вучняў, дазваляе ўвесці паняцце сінтаксічнай сінанімікі. Таксама прадугледжваю заданні на пераклад асобных моўных адзінак, пераказ па апорных словазлучэннях, работу з вобразнымі сродкамі. Адзін з прыкладаў – заданні да тэксту “Курган Славы”, якія вучні выконваюць на ўроку падагульнення і сістэматызацыі па раздзеле “Дзеепрыметнік” (дадатак 2.4.).

Змест і характар заданняў накіраваны на стварэнне ўмоў для ўдасканалення ўменняў вучняў вылучаць апорныя словазлучэнні і пераказваць па іх тэкст, навыку перабудоўваць сказы з улікам пунктуацыйных норм, навыку перакладу на рускую мову з захаваннем стылістычных асаблівасцей тэксту, для фарміравання каштоўнасных арыентацый вучняў.

Работа з тэкстам працягваецца ў 8 – 9 класах. Асаблівая ўвага надаецца заданням аналітычнага і творчага характару: вызначыць тэму і асноўную думку тэксту, вылучыць прыкметы тэксту, прааналізаваць сувязь паміж часткамі і сказамі, адзначыць агульнае і адрознае ў тэкстах рознага стылю і тыпу, адказаць на пытанне, пастаўленае ў тэксце, пашырыць пэўную частку тэксту за кошт увядзення апісання (разважання), прадоўжыць або закончыць тэкст, напісаць на тэму дадзенага тэксту некалькі сказаў у іншым стылі, пераказаць тэкст ад імя іншай асобы, прыдумаць на аснове тэксту дыялог, скласці памятку (інструкцыю, аб'яву, рэкламу, віктарыну, пост для абмеркавання ў сацыяльнай сетцы), напісаць эсэ (сінквейн, хоку). Характар і колькасць падобных заданняў вызначаю ў адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі вучняў, колам іх асабістых інтарэсаў, прапаную некалькі заданняў на выбар. Напісанне ўласнага тэксту вызначанага тыпу і жанру па прапанаванай тэме дэманструе ўзровень сфарміраванасці ў вучняў умення падбіраць адпаведны фактычны матэрыял, моўныя сродкі, рэалізаваць у сістэме набытыя веды па арфаграфіі, пунктуацыі, стылістыцы.

**2.3. Выніковасць і эфектыўнасць вопыту**

**2.3.1.** Асноўным крытэрыем для дыягностыкі паспяховасці майго вопыту з'яўляецца павышэнне сярэдняга бала вучняў пры напісанні пераказаў і сачыненняў па беларускай мове за перыяд 2018 – 2021 навучальных гадоў. Прадстаўленыя дадзеныя па выніках вышэй указаных работ на прыкладзе 7 класа дазваляюць прасачыць станоўчую дынаміку у развіцці моўных, маўленчых, камунікатыўных уменняў вучняў.

Вопыт паказвае, што пры планаванні дзейнасці вучняў на ўроку з улікам тэкстацэнтрычнага падыходу школьнікі паступова вучацца ўважліва чытаць тэкст, усведамляць яго змест, аналізаваць асаблівасці кампазіцыі, вызначаць месца і ролю асобных моўных адзінак, назапашваюць фактычны матэрыял, удасканальваюць навыкі перакладу, тлумачэння цяжкіх для разумення слоў.

**2.3.2.** Сярэдні бал па выніках кантрольных пераказаў і творчых работ вучняў: параўнальная табліца

| Навучальны год | Кантрольны пераказ | | Кантрольны пераказ | | Творчыя работы (сачыненні) | | Сярэдні бал за год |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Змест і моўнае афармленне | Граматнасць | Змест і моўнае афармленне | Граматнасць | Змест і моўнае афармленне | Граматнасць | |
| 2018 – 2019 | 5,7 | 4,1 | 5,9 | 3,9 | 6,1 | 4,2 | 5,0 |
| 2019 – 2020 | 6,1 | 3,8 | 6,2 | 3,9 | 6,3 | 4,5 | 5,2 |
| 2020 – 2021 | 6,3 | 3,9 | 7,1 | 4,3 | 6,4 | 5 | 5,5 |

**2.3.3.** Галоўнай умовай, якая станоўча ўплывае на выніковасць і эфектыўнасць вопыту, з’яўляецца метадычная падрыхтоўка настаўніка і выкарыстанне на практыцы тэкстацэнтрычнага падыходу ў сістэме, пачынаючы з 5 класа. Дадзеная работа прадугледжвае як работу з тэкстамі ў вучэбных дапаможніках, так і выкарыстанне дадатковага матэрыялу.

## 3. Заключэнне

**3.1.** Назіранні за працэсам навучання, аналіз якасці творчых работ у форме пераказаў і сачыненняў паказалі, што тэкстацэнтрычны падыход да навучання забяспечвае паступовае развіццё ў вучняў навыкаў усвядомлена ўспрымаць тэкставую інфармацыю, суадносіць змест тэксту з раней прачытаным і ўласным жыццёвым вопытам, аналізаваць семантычную і сінтаксічнаю структуру тэксту, замацоўваць уменне аналізаваць моўныя адзінкі, выкарыстаныя ў тэксце, з пункту гледжання фанетычных, лексічных, арфаэпічных, марфалагічных, сінтаксічных і пунктуацыйных норм беларускай мовы, а таксама ўменне ствараць уласныя выказванні. Работа з тэкстам для вучняў стала звыклым відам дзейнасці, дзякуючы якому заўсёды ёсць магчымасць наладзіць з вучнямі дыялог на разнастайныя тэмы, абмеркаваць прачытанае,

правесці паралелі з навуковай інфармацыяй, атрыманай на ўроках па іншых вучэбных прадметах.

**3.2.** У далейшым плануючы ўдасканальваць работу з тэкстам, у прыватнасці, знайсці больш шырокае прымяненне заданняў у форме квэста.

**3.3.** Вопыт педагагічнай дзейнасці прадстаўлены на паседжанні школьнага метадычнага аб'яднання па тэме "Рэалізацыя на вучэбных занятках ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей як умова актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў" (02.04.2021 года) , заслуханы на педагагічным Савеце па тэме "Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі – у дапамогу настаўніку" (26.12.2020 года), у сакавіку 2021 года праведзены адкрыты ўрок для педагогаў установы адукацыі па тэме "Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле "Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне".

Матэрыялы з вопыту работы размешчаны на сайце ўстановы адукацыі ў раздзеле "Файлавы архіў. Адкрытыя ўрокі".

Лічу, што прадстаўлены мною практычны матэрыял можа выкарыстоўвацца настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры на ўроках падагульнення і сістэматызацыі ведаў і ўдасканалення навыкаў і ўменняў, а таксама на ўроках камбінаванай будовы з улікам магчымасцей класа і ступені падрыхтаванасці.

Спіс  выкарыстаных крыніц

1. Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай  мовай навучання і выхавання:  9 клас. – Мінск., Нацыянальны інстытут адукацыі,  2019. – с. 3 – 15.
2. Казачэнка І.Р. Тэкстацэнтрычны падыход як неабходная ўмова фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http: //presentdaymova.files.wordpress.com.  – Дата доступу: 03.03.2021.
3. Ляшчынская В.А. Тэкстацэнтрычны прынцып навучання беларускай мове. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http:// eprints.mdpu.org.ua/id/eprint/3251/. –  Дата доступу: 03.03.2021.
4. Сілюк Н.У. Працуем з тэкстам на ўроках беларускай мовы ў 6 класе: дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рус. і белар. мовамі навучання. / [склад. Н. У. Сілюк].  – Мазыр: Выснова, 2019. – 38, [2]  с.

Дадатак 1

**План-канспект урока беларускай мовы ў 9 класе**

**Тэма:** Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле “Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне”

**Мэта ўрока:** фарміраванне моўнай, маўленчай, камунікатыўнай кампетэнцый

**Задачы ўрока:**

1) падагульніць і сістэматызаваць веды пра складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, іх пунктуацыйнае афармленне;
2) удасканальваць уменні выяўляць у тэкстах складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, вылучаць сэнсавыя часткі ў іх, вызначаць разнавіднасці складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак, межы і сродкі сувязі частак, будаваць схемы складаных сказаў;
3) удасканальваць уменні вызначаць стыль тэксту, моўныя сродкі, характэрныя для пэўнага стылю, ствараць уласныя тэксты ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай.

**Тып урока:** урок падагульнення і сістэматызацыі ведаў і ўдасканалення навыкаў і ўменняў

**Ход урока**:

**I. Матывацыйна-арганізацыйны этап**

1. Арганізацыйна-псіхалагічная падрыхтоўка вучняў да работы.

2. Аб’яўленне тэмы ўрока. Самастойнае фармуляванне вучнямі задач урока ў адпаведнасці з тэмай.

**II. Пазнавальна-аперацыйны этап**

1. Праверка дамашняга задання (параграф 31, тэарэтычны матэрыял). Рашэнне тэставых заданняў па тэме “Знакі прыпынку паміж часткамі складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак”.

Заданне:  расстаўце знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак, растлумачце свой выбар (удасканальвае ўменне вучняў вызначаць межы і сродкі сувязі частак у складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак, правільна пунктуацыйна афармляць іх)

1) Цёмныя ночы тояць нейкі ўрачысты спакой  і неба ніжэй нахіляецца да зямлі каб падслухаць яе адвечную скаргу.

2) Над лугам пырхалі лёгкія матылькі  гулі пчолы  выцалоўваючы званочкі кветак  а ў сонечным перапіве заліваліся радасцю жаваранкі.

3) Ціха было непрывычна не шумела галькаю хваля і недзе далёка за санаторыем абзываўся горад сігналамі машын гулам матораў.

4) Маці спачатку засмяялася ад нечаканасці а потым на твары яе з’явіўся неспакой сінявата-шэрыя стомленыя вочы трывожна ўставіліся надзяўчынку.

5) Нечакана з цёмнага неба пайшоў дождж наляцеў густы вільготны вецер і Вера надумала вярнуцца але самалюбства прызнанай у вёспы рыбачкі клікала наперад.

6) На дварэ гуляе мяцеліца а ў мяне ў пакоі восенню пахне на стале у тонкай крыштальнай вазачцы лісце .

7) Мірон уважліва паглядзеў на свайго таварыша і толькі цяпер заўважыў як той змяніўся за гэты час не толькі шчокі але і нос і рот і нават вочы здаваліся не тымі.

2. Удасканаленне навыкаў і ўменняў на аснове прымянення абагульненых ведаў у новых сітуацыях.

Работа з тэкстам “Вёска Уюн”

*Праяўленне цікавасці да гістарычных звестак пра свій горад, мястэчка, вёску ўласціва кожнаму чалавеку амаль з нараджэння і да самага скону. Мы імкнёмся адшукваць шляхі да сваіх каранёў, святынь.*

*Мая вёска Уюн, што знаходзіцца на Быхаўшчыне, здаецца, нічым не адрозніваецца ад іншых вёсак, якіх тысячы на Беларусі. Не нарадзіла яна найвядомейшых літаратараў, мастакоў, слынных вучоных. Але Уюн мае сваю адметнасць, непаўторнасць, бо кожная вёска – гэта своеасаблівая краіна, з*

*усім сваім: моваю, звычаямі, норавамі і побытам. І заўсёды яна ў маіх вачах паўстае ў найпрыгажэйшых колерах.*

*Куды б ні закінуў мяне творчы лёс, я заўсёды згадваю мой дарагі куточак Уюн, дзе нарадзіўся, дзе прайшлі гады майго маленства і юнацтва.*

*Па сведчанні старажылаў, некалі на месцы вёскі Уюн быў непралазны лес і бурліла невялікая рачулка, у якой вялося шмат рыбы, асабліва ўюноў. Калі гэтую мясціну пачалі засяляць людзі, яны выкарчоўвалі лес і будавалі свае хаты ўздоўж рэчкі. Таму і вёска выцягнулася, як той уюн, у адну доўгую вуліцу на добрую сотню двароў. Адсюль дзве версіі паходжання назвы вёскі. Першая – ад рачулкі, якую назвалі ласкава Уюнком. Другая – ад характару забудовы.*

*Рачулка Уюнок, нібы пужлівы лясны звярок, абыходзіць агароды і крадзецца на альховым зарасніку ўзбоч вёскі, нібы баіцца, каб часам людзі яе не пакрыўдзілі. І толькі можа ўволю пацешыцца, калі злучае сваю плынь з ракой Грэзай, якая працякае праз суседнюю вёску.*

Калектыўнае вуснае выконванне заданняў (удасканаленне ўменняў вызначаць тэму і галоўную думку тэксту, стыль, у якім напісаны тэкст, і сродкі, адпаведныя стылю, уменняў складаць план тэксту, тлумачыць правапіс уласных назоўнікаў, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах ускладненай будовы, пашырэнне лексічнага запасу вучняў).

1. Прачытайце тэкст. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Чаму людзі праяўляюць цікавасць да гістарычных звестак пра свой горад, мястэчка, вёску. Пра што можна даведацца з назваў гарадоў, мястэчак, вёсак?
2. Вызначце стыль маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.
3. Складзіце план тэксту адпаведна колькасці абзацаў.
4. З дапамогай якіх моўных сродкаў аўтар апісвае рачулку Уюнок?
5. Растлумачце значэнне наступных слоў і выразаў: да самага скону, слынныя вучоныя, версія, святыня, характар забудовы.
6. Знайдзіце ўжытыя ў тэксце ўласныя назвы. Растлумачце іх правапіс.
7. Растлумачце пастаноўку ў сказах двукроп’я і працяжнікаў.

**Фізкультхвілінка.**

Выкарыстоўваецца трэнажор для вачэй.

**III. Дыягнастычна-карэкцыйны этап**

Пісьмовае выконванне заданняў да тэксту “Вёска Уюн”

1. Вызначце тып складанага сказа, які складае трэці абзац, намалюйце яго схему.
2. Знайдзіце і выпішыце з тэксту складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, вызначце граматычную аснову ў кожнай з частак, віды сувязі паміж часткамі, складзіце схемы сказаў.

**IV. Завяршальны этап. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

Метад “Завяршы фразу”

Настаўнік прамаўляе незавершаную фразу і паказвае на вучня, які яе завяршае. Фразы: “Падчас урока мне было складана…”, “Самае цяжкае (лёгкае) заданне для мяне было…”.

**V. Дамашняе заданне.** Інфармацыя пра дамашняе заданне. Складзіце невялікае выказванне на тэму “Адкуль пайшла назва маёй роднай вёскі?”, з выкарыстаннем розных тыпаў складаных сказаў. Пры неабходнасці карыстайцеся даведачнай літаратурай, у прыватнасці, тапанімічным слоўнікам Гомеля і Гомельскага раёна пад рэдакцыяй Рогалева А.Ф., інтэрнет – крыніцамі.

Дадатак 2

**2.1. Дыдактычны матэрыял да ўрока ў 5 класе па тэме “Прамое і пераноснае значэнне слова”. Праца з тэкстам.**

“Сакавік цяплом усіх прывячае,” – паведамляе народная мудрасць. А другая знарок яму пярэчыць: “У сакавіку і спераду зіма і ззаду”. Каляндар адлічвае першыя веснавыя дні. Бачыце – румзаюць з дахаў вастраносыя ледзяшы? Чуеце – звіняць капяжы і сінічкі? А ў гракоў прастуджаныя галасы, бо многія разам з варонамі ды галкамі зімавалі побач з намі.

Наступае 22 сакавіка. Птушынае свята Саракі. Сказана як звязана: “На саракі прыл…цела сор…к птушак з-за ракі”. Лічылася, што менавіта ў гэты дзень з далёкага выраю на радзіму в…ртаюцца першыя сор…к жаваранкаў. У гонар жаўрукоў п…клі з цеста птуш…чак і сп…валі: “Жавароначкі, прыл…ціце, цёпла лецейка прын…сіце!” [5, с.36]

**Заданне да тэксту:**

1. Вызначце тэму тэксту. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з тэмай.
2. Якія вясновыя народныя святы вы ведаеце яшчэ?
3. Звярніце ўвагу на выказванні пра сакавік. Як называецца гэты жанр народнай творчасці?
4. Вызначце стыль тэксту. Па якіх прыкметах вы гэта вызначылі?
5. Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Растлумачце свой выбар.Выпішыце іх у складзе словазлучэнняў.
6. Ахарактарызуйце сказы ў тэксце ў залежнасці ад мэты выказвання.
7. Знайдзіце сказ, у якім ужыты зваротак. Нагадайце правіла пунктуацыйнага афармлення зваротка на пісьме.
8. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай. Складзіце схемы дадзеных сказаў.
9. Спішыце апошні абзац, устаўце прапушчаныя літары. Якія спецыфічна беларускія моўныя з’явы мы тут назіраем?
10. Складзіце ўласнае выказванне на тэму “Вясна, вясна доўгачаканая!” ў мастацкім стылі. Уключыце ў сваё выказванне словы ў пераносным значэнні.

**2.2. Дыдактычны матэрыял да ўрока ў 5 класе па тэме “Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле “Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”. Квэст на аснове тэксту “Валошка”.**

Расце валошка як пустазелле ў жыце, у полі, уздоўж дарог. **Цвіце** пераважна ад чэрвеня да верасня. У свеце **існуе** вялікае мноства відаў валошак самых розных колераў: блакітныя, сінія, ружовыя, жоўтыя, **белыя**, ліловыя. Але для беларусаў самай вядомай і звыклай **з’яўляецца** менавіта валошка сіняя.

Яна справядліва лічыцца нашай нацыянальнай кветкай, адным з сімвалаў Беларусі. Ёй прысвячалі вершы і песні Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас і многія іншыя беларускія паэты. Узор валошкі вышываюць на ручніках, абрусах, хустках.

**Маршрутны ліст**

| **Маршрут** | **Заданне** | **Прозвішча, імя вучня** |
|---|---|---|
| Станцыя “Фанетычная” | Зрабіце гукавы запіс выдзеленых слоў | |
| Станцыя “Арфаэпічная” | Выпішыце з тэксту 5 слоў, вымаўленне якіх адрозніваецца ад напісання | |
| Станцыя “Графічная” | Запішыце ў алфавітным парадку колеры валошак | |
| Станцыя “Арфаграфічная” | Выпішыце з тэксту словы, якія можна выкарыстаць для слоўнікавага дыктанта на правіла правапісу літар е, ё, я. | |

| | | |
|---|---|---|
| Станцыя Узаемадапамогі | Падбярыце загаловак да тэксту, які ілюструе галоўную думку | |
| | Прыгадайце, дзе выкарыстоўваецца валошка як сімвал Беларусі | |
| | Аргументуйце пастаноўку двукроп'я ў трэцім сказе. Намалюйце схему гэтага сказа. | |

### 2.3. Дыдактычны матэрыял да ўрока ў 6 класе па тэме "Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле "Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія". Работа з тэкстам.

Заяц – часты персанаж беларускіх народных казак пра жывёл. Даверлівы і крыху хлуслівы, задавака і гультай, а галоўнае – вельмі баязлівы, ён заўсёды выклікае сімпатыю і спачуванне.

У беларускай мове нярэдка выкарыстоўваюцца фразеалагізмы **зайцаў хлеб, злавіць зайца.** Зайцаў хлеб – хлеб незвычайны. Так называюць …

Згодна з народнымі ўяўленнямі, ад зайца разам з хлебам павінны перадацца дзецям жыццяздольнасць, спрыт, жвавасць. Лічылася, што гэты чароўны хлеб будзе дабратворна ўплываць на рост, развіццё і здароўе дзіцяці.

Фразеалагізм **злавіць зайца** мае значэнне … Аднак злавіць такога спрытнага, жвавага звярка няпроста, практычна немагчыма. Таму фразеалагізм ужываецца ў гаворцы тады, калі…

**Заданні да тэксту:**

1. Падбярыце загаловак да тэксту, абгрунтуйце свой выбар.
2. Дапоўніце сказы другога і трэцяга абзацаў. Якое значэнне маюць выдзеленыя фразеалагізмы?
3. Якія прыказкі і прымаўкі са словам "хлеб" вы ведаеце?

4. Растлумачце пастаноўку працяжніка ў першым сказе і другім сказе другога абзаца. Спішыце першы сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор.
5. Знайдзіце ў тэксце словы, утвораныя спосабам складання. Выпішыце іх, зрабіце словаўтваральны разбор.
6. Знайдзіце ў тэксце словы, утвораныя прыставачным спосабам. Выпішыце іх у складзе словазлучэнняў, абазначце прыстаўкі.
7. Выпішыце з трэцяга абзаца невытворныя словы ў пачатковай форме.
8. Напішыце міні-сачыненне на тэму "Зайцаў хлеб", выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту і ўласны жыццёвы вопыт.

## 2.4. Дыдактычны матэрыял да ўрока ў 7 класе па тэме "Падагульненне і сістэматызацыя па раздзеле "Дзеепрыметнік". Работа з тэкстам "Курган Славы".

Стаяць на зямлі Беларусі помнікі, абеліскі і мемарыяльныя ансамблі. І сярод іх – грандыёзны Курган Славы. Ён узняўся на стагоддзі сімвалам нязгаснай доблесці нашых воінаў.

Чатыры штыкі вянчаюць Курган Славы. Яны ўзняты ў гонар чатырох франтоў, якія бліскуча правялі аперацыю "Баграціён" і вызвалілі Беларусь ад гітлераўскіх захопнікаў.

Тут, на Кургане, змяшалася зямля, прывезеная з гарадоў-герояў і з усіх памятных мясцін рэспублікі. А з яго вяршыні адкрываецца цудоўны краявід. Вакол раскінуліся ахутаныя зялёнымі барамі ўзгоркі, люстраная гладзь рэк, палі і лугі ў квецені, шырокія стужкі дарог. І кожны, хто ідзе або едзе да Кургана Славы, абавязкова спыніцца тут, каб схіліць галаву перад нязгасным подзвігам воінаў-вызваліцеляў.

**Заданні да тэксту:**

1. Вызначце тып і стыль тэксту.

2. Складзіце план тэксту. Выпішыце з кожнага сказа апорныя словазлучэнні, па якіх вам будзе лёгка пераказаць тэкст. Вусна перакажыце тэкст.

3. Знайдзіце ў тэксце эпітэты. Якую сэнсава-стылістычную ролю яны выконваюць?

4. Вызначце ў тэксце сказы з дзеепрыметнікавымі зваротамі. Зрабіце графічныя схемы дадзеных сказаў.

5. Перабудуйце сказ, у якім дзеепрыметнікавы зварот стаіць перад паясняемым словам, так, каб зварот стаяў пасля паясняемага слова. Запішыце новы сказ, расстаўце знакі прыпынку.

6. Выпішыце з тэксту дзеепрыметнік, ужыты ў кароткай форме, абазначце, якім членам сказа ён з’яўляецца. Утварыце і запішыце яго поўную форму.

7. Перакладзіце першы і другі абзац на рускую мову.

8. Якія помнікі-сімвалы доблесці нашых воінаў вы ведаеце? Як ушаноўваецца памяць пра воінаў-вызваліцеляў у вашым родным горадзе (пасёлку)?